УДК 821.161.3

**В. П. Шаўчэнка, М. М. Шаўчэнка (Мазыр, Беларусь)**

# ПАРАЎНАЛЬНЫ АНАЛІЗ МАСТАЦКАГА ТЭКСТУ
## (на прыкладзе мастацкіх твораў Я. Лучыны і І. С. Тургенева)

*У артыкуле на прыкладзе паэмы Я. Лучыны «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся» і апавяданняў І. С. Тургенева «Запіскі паляўнічага» праведзены параўнальны аналіз мастацкіх тэкстаў на літаратуразнаўчым ўзроўні. Надаецца ўвага выпрацоўцы ўмення бачыць творчую індывідуальнасць пісьменніка, выяўленню ўплыву прыёму параўнання на актывізацыю мыслення вучняў.*

Гістарычны адрэзак часу, у які мы жывём, кожны дзень прыносіць нешта новае не толькі ў наша асабістае жыццё, але і ў сістэму адукацыі, якая з'яўляецца неад'емнай часткай існавання грамадства. За апошняе дзесяцігоддзе адбыліся істотныя змены ў сістэме адукацыі, якія закранулі яе тэарэтыка-метадалагічныя асновы, змест і структуру праграм, методыку і арганізацыю навучальна-выхаваўчыга працэсу. Натуральна, што пытанні рэфармацыі школы хвалююць вялікае кола грамадства, набываюць асаблівую актуальнасць у наш час.

Мастацкая літаратура становіцца ўсё больш дзейсным сродкам сацыялізацыі школьнікаў, а метадычная навука шукае новыя, больш эфектыўныя спосабы далучэння падлеткаў да мастацкага слова. Адным з такіх спосабаў з'яўляецца параўнанне як прыём аналізу літаратурнага твора. Дадзеная праблема набывае актуальнасць гучання, бо вывучэнне беларускай літаратуры ў яе тыпалагічных сувязях з іншымі літаратурамі адкрывае перад вучнямі неабмежаваныя магчымасці ў іх духоўна-маральным і эстэтычным выхаванні.

Вывучэнне беларускай літаратуры немагчыма без параўнальнага метаду. Гэты метад заснаваны на наступных прынцыпах: гісторыка-тыпалагічных адносін; узаемадапаўненне (розныя бакі праблем); устанаўленне сувязі (уплыў творчасці аднаго пісьменніка на творчасць другога). Выкарыстанне параўнальнага метаду немагчыма без такіх паняццяў як суаднясенне, супастаўленне, асацыяцыя.

Параўнанне з'яўляецца вельмі дзейсным прыёмам пры аналізе мастацкага твора. Такі падыход да арганізацыі ўрока не толькі павышае цікавасць вучняў да мастацкага твору, але і актывізуе свядомае засваенне новага матэрыялу.

У сувязі з тым, што творы для супастаўлення павінны адпавядаць патрабаванням нацыянальнай школы і грунтавацца на цэласным адзінстве і ўзаемасувязі нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей, можна прапанаваць вывучэнне паэмы Я. Лучыны «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся» ў супастаўленні з «Запіскамі паляўнічага» І. С. Тургенева. Такі падыход вывучэння твораў вельмі актуальны ў наш час, так як параўнальны метад дае магчымасць правесці мяжу паміж падабенствам і адрозненнем творчасці пісьменнікаў, зразумець іх этычныя і эстэтычныя погляды, ацаніць адметнасць мастацкага стылю твораў.

Літаратура ў большай меры, чым іншыя школьныя прадметы задавальняе патрабаванні эстэтычнага выхавання. Абумоўлена гэта прыродай мастацкага слова, здольнага цэласна, шматаспектна ўздзейнічаць на асобу чалавека, фарміраваць яго інтэлект, пачуцці, волю, светабачанне і светаадчуванне, адкрываць шырокі свет грамадскіх маральна-этычных і мастацка-эстэтычных каштоўнасцей.

Адным з важнейшых накірункаў працы на ўроку з'яўляецца аналіз літаратурнага твора, «пры якім прадмет вывучэння раскладваецца на састаўныя часткі ці ўяўна расчляняецца шляхам лагічнай абстракцыі. Прааналізаваць твор – г. зн. знайсці той узровень зносін з мастацтвам, калі адбываецца пераход ад успрымання да мастацкіх абагульненняў» [1, 39]. На аналіз твора можа адводзіцца цэлы ўрок, частка ўрока або некалькі ўрокаў.

На сучасным уроку беларускай літаратуры перад настаўнікам стаіць задача абудзіць творчую актыўнасць вучняў, прагу пазнання, пачуццё прыгажосці, унутраную патрэбу адчуваць мастацкае слова, перажываць, тварыць прыгожае.

Разгледзім гэта пытанне на прыкладзе параўнання як прыёму аналізу мастацкага твора. У школьнай практыцы выдзяляецца шмат прыёмаў і метадаў аналізу мастацкага твора. У кожным канкрэтным выпадку шляхі, метады, прыёмы аналізу абумоўліваюцца адметнасцю, непаўторнасцю ідэйнага зместу твора, спецыфікай жанру, своеасаблівасцю стылю, узроставымі асаблівасцямі вучняў, іх літаратурнай падрыхтоўкай.

Параўнальны аналіз паэмы Я. Лучыны «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся» і апавяданняў «Запіскі паляўнічага» І. С. Тургенева пашырыць знаёмства вучняў з іх багатай спадчынай. Вучні на ўроку павінны выявіць рысы, якія аб'ядноўваюць прапанаваныя творы: праблематыка; вобразы; грамадскае асяроддзе; моўныя сродкі і г. д.

Карыстаючыся прыёмам параўнання, творы І. С. Тургенева і Я. Лучыны можна разглядаць у наступных напрамках: вобраз паляўнічага; мастацкае адлюстраванне сялянскага побыту; прырода ў мастацкім асэнсаванні пісьменніка.

Цікава звярнуцца да тэмы, што аб'ядноўвае творы. Гэта тэма прыроды, якая ў паэме Я. Лучыны прадстаўлена як тыповыя абставіны жыцця чалавека:

«Прыгожы, некрануты край перада мною,
Чарот бязмежны, пушча з сіняй глыбінёю,
Дзе хвой выносістых завершаны стажок,
Як галаву, траха пасерабрыў сняжок,
А побач клён раскошны...» [2, 52].
«Нібыта стужка, лес наперадзе далёка
Раскінуўся, абняўшы небакрай шырока.
А жнівеньскае сонца прыспарала жар,
Блакітны промнямі выбельвала абшар» [2, 57].
«Вось волат-дуб, над гуртам дрэў дасяг ён хмар.
Разложысты. Наўкол дзяржавец-валадар
Забраў вялікую прастору ад суседзяў.
Пры ім, пад ім жывуць, існуюць зараз ледзьве
Гатункаў розных карлікі – падданцы ўсе
Манарха, прышласць ім надзей не прынясе. « [2, 59].

Менавіта ў вобразе Грышкі выявіўся погляд на прыроду як на жывую, у нечым загадкавую з'яву. Вуснамі свайго героя Я. Лучына пратэстуе супраць вынішчэння прыроды, звязаных з гэтым перамен ва ўзаемаадносінах людзей:

«Спусцее Паграбішча, пойдзе ўсё на звод,
І ў Муты схоча ліпкі на прыбыткі зброд,
Пакуль не выссуць сокаў, бы кляшчы з зямелькі,
Да ніткі абскубуць...Як рады дасць тады
Жыхар, якога жывяць Чорныя Ляды,

МГПУ им. И.П.Шамякина

Калі за венік нават, што цяпер дармовы,

Плаціць павінны грошы» [2, 47].

Па-майстэрску І. С. Тургенеў апісвае ў «Запісках паляўнічага» родную прыроду. Пейзажныя апісанні сустракаюцца практычна на кожнай старонцы твора. Вось напрыклад, апісанне жывапісных мясцін, дзе адбываецца паляванне: «Солнце село, но в лесу еще светло, воздух чист и прозрачен; птицы болтливо щебечут; молодая трава блестит веселым блеском изумруда...Лесной запах усиливается, слегка повеяло теплой сыростью; влетевший ветер около вас замирает...[3, 11-12].

І. С. Тургенеў у сваім творы паказвае родную прыроду больш дэталёва, у асноўным гэта залежыць і ад разнавіднасці жанру, і ад умення перадаць чытачу ўласныя назіранні: «Погода была прекрасная, еще прекраснее, чем прежде; но жара все не унималась. По ясному небу едва-едва неслись высокие и редкие облака, изжелта-белые, как весенний запоздалый снег, плоские и продолговатые, как опустившиеся паруса. Их узорчатые края, пушистые и легкие, как хлопчатая бумага, медленно, но видимо изменялись с каждым мгновением; они таяли, эти облака, и от них не падало тени» [3, 76].

Любая з’ява прыроды знаходзіць сваё мастацкае адлюстраванне на старонках «Запісак паляўнічага» І. С. Тургенева: «Но вот наступает вечер. Заря запылала пожаром и обхватила пол-неба. Солнце садится. Воздух вблизи как-то особенно прозрачен, словно стеклянный; вдали ложится мягкий пар, теплый на вид; вместе с росой падает алый блеск на поляны, еще недавно облитые потоками жидкого золота; от деревьев, от кустов, от высоких стогов сена побежали длинные тени…» [3, 238]. Апісанне прыродных з’яў у творы падаецца непаспешліва і паслядоўна: «Солнце село; звезда зажглась и дрожит в огнистом море заката… Вот оно бледнеет; синеет небо; отдельные тениисчезают, воздух наливается мглою…» [3, 238].

Апісваючы прыроду Арлоўшчыны, І. С. Тургенеў запрашае чытача паехаць з ім, каб апошні мог уласна адчуць яднанне чалавека з прыродай. Трэба адзначыць, што гэта выдатна атрымліваецца ў пісьменніка. Чытаючы наступныя радкі, узнікае адчуванне, што непасрэдна сам бачыш усё сваімі вачыма: «Погода прекрасная; кротко синеет майское небо; гладкие молодые листья ракит блестят, словно вылитые; широкая, ровная дорога вся покрыта той мелкой травой с красноватым стебельком, которую так охотно щипают овцы, направо и налево по длинным скатам холмов, тихо зыблется зеленая рожь; жидкими пятнами скользят по ней тени небольших тучек...» [3, 126].

У сувязі з тым, што ў «Запісках паляўнічага» І. С. Тургенева паляўнічыя палююць у асноўным на птушак, пісьменнік апісвае птушынае асяроддзе вельмі яскрава, з вялікай пільнасцю і ўважлівасцю: «ястреба, кобчики, пустельки со свистом носились над неподвижными верхушками, пестрые дятлы крепко стучали по толстой коре; звучный напев черного дрозда раздавался в густой листве вслед за переливчатым криком иволги; внизу, в кустах, чирикали и пели малиновки; зяблики проворно бегали по дорожкам...» [3, 135].

Паказальным у плане апісання роднай прыроды можна лічыць апавяданне з цыклу «Запісак паляўнічага» І. С. Тургенева, якое закрывае цыкл і мае эпіграф:

«И понемногу начало назад
Его тянуть: в деревню, в темный сад,
Где липы так огромны, так тенисты,
И ландыши так девственно душисты,
Где круглые ракиты над рекой
С плотины наклонились чередой...
Там хорошо...» [3, 236].

«Лес і стэп» – адно з выдатнейшых апавяданняў, якое найбольш яскрава паказвае нам прыгажосць рускай прыроды. І. С. Тургенеў прадстаўляе чытачу кругаварот гэтай жывой з’явы. Тут мы бачым вясну, дзе так «вольно дышит грудь, как бодро движутся члены, как крепнет весь человек, охваченный свежим дыханьем весны!» [3, 237]; лета, калі «весело сверкает все кругом, как воздух свеж и жидок, как пахнет земляникой и грибами» [3, с. 237]; восень, паветра якой «подобна запаху вина» [3, 238], пры гэтым «вся жизнь развертывается легко и быстро, как свиток» [3, 239]; зіму з «морозным днем, когда береза, словно сказочное дерево, вся золотая, красиво рисуется на бледно-голубом небе, когда низкое солнце уже не греет, но блестит ярче летнего» [3, 239].

Такім чынам, выкарыстанне прыёму параўнання дасць магчымасць старшакласнікам па-новаму зірнуць на творчасць беларускага і рускага пісьменнікаў, дапаможа ўбачыць прыгажосць малюнкаў прыроды, адметнасць мастацкага стылю твораў.

**Літаратура**

1. Руцкая, А. В. Методыка выкладання беларускай літаратуры: вучэбна-метад. дапам. / А. В. Руцкая, М. У. Грынько. – Гродна, 2004.
2. Лучына, Я. Творы: вершы, нарысы, перакалады, лісты / Я. Лучына. – Мінск., 1988.
3. Тургенев, И. С. Записки охотника: повести и рассказы / И. С. Тургенев. – Минск, 1984.

МГПУ им. И.П. Шамякина